ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік управлення культуры Гродзенскага аблвыканкама
А.В.Клімовіч
“30” декабря 2022 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ**
**аб парадку арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку “Бібліятэка.by”**

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн- крыжаванку “Бібліятэка.by” (далей – Конкурс).

2. Арганізатарамі Конкурсу з’яўляюцца ўпраўленне культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага”.

3. Для правядзення Конкурсу складаецца аргкамітэт (Дадатак 1).

4. Конкурс праводзіцца з мэтай актывізацыі работы публічных бібліятэк па стварэнні ўласных электронных інфармацыйных рэсурсаў, пашырэння іх асартыменту і павышэння якасці электронных паслуг; удасканалення і папулярызацыі ўласных сайтаў, старонак у сацыяльных сетках, павелічэння колькасці віртуальных зваротаў карыстальнікаў бібліятэк.

5. Задачамі Конкурсу з’яўляюцца:

- папулярызацыя кнігі і чытання сярод падрастаючага пакалення праз стварэнне інфармацыйна-забаўляльных рэсурсаў;
- актывізацыя пазнавальнай дзейнасці і творчай актыўнасці карыстальнікаў публічных бібліятэк;
- садзейнічанне фарміраванню агульнай культуры і інтэлектуальна-творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі;
- развіццё навыкаў працы з электроннымі інтэрактыўнымі рэсурсамі;
- паляпшэнне якасці сацыякультурнай дзейнасці публічных бібліятэк рэгіёну праз выкарыстанне інтэрактыўна-забаўляльных рэсурсаў уласнай генерацыі;

- стымуляванне творчай актыўнасці супрацоўнікаў бібліятэчных устаноў.

6. У Конкурсе прымаюць удзел публічныя бібліятэкі Гродзенскай вобласці (далей – Удзельнікі).

7. Удзельнікі павінны распрацаваць і прадставіць на ўласных сайтах і ў сацыяльных сетках інфармацыйна-забаўляльныя рэсурсы: віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку.

Конкурсныя работы могуць быць распрацаваны з удзелам сацыяльных партнёраў і валанцёраў. Вузкая тэматыка не абмежавана (патрытычная, прававая, літаратуразнаўчая, экалагічная, здаровы лад жыцця, сямейнае выхаванне і г.д.).

8. Конкурс праводзіцца па двух намінацыях:

- лепшы інфармацыйна-забаўляльны рэсурс, створаны раённымі (цэнтральнай гарадской) і гарадскімі бібліятэкамі;

- лепшы інфармацыйна-забаўляльны рэсурс, створаны гарпасялковымі і сельскімі бібліятэкамі.

9. Для ўдзелу ў Конкурсе неабходна накіраваць заяўку па форме (Дадатак 2) і прадаставіць матэрыялы ў друкаваным і электронным выглядзе.

10. Матэрыялы, прадстаўленыя на Конкурс, павінны ўключаць:

- апісанне рэсурсу;

- электронныя інфармацыйныя рэсурсы ці спасылкі на іх;

- дадаткі (водгукі ўдзельнікаў, сцэнарыі мерапрыемстваў з выкарыстаннем дадзеных рэсурсаў, публікацыі ў СМІ, спасылкі на інтэрнэт-рэсурсы);

- атрыманыя вынікі.

11. Ацэнка вядзецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да афармлення, а таксама па асноўных крытэрыях:

- арыгінальнасць аўтарскай ідэі і афармлення;

- адпаведнасць матэрыяла вызначанай тэме і чытацкаму прызначэнню;

- майстэрства выканання;

- візуальная зручнасць успрымання інфармацыі, адзінства стылю;

- перспектыўнасць выкарыстання;

- размяшчэнне інфармацыйных рэсурсаў у інтэрнэт-прасторы ў перыяд з 1 лютага па 30 красавіка 2023 года.

12. Матэрыялы, прадстаўленыя на Конкурс, павінны быць афармлены ў адпаведнасці з наступнымі патрабаваннямі:

- тэкст набраны ў тэкставым рэдактары Microsoft Word, шрыфт – Times New Roman, памер – 14, інтэрвал – 1;

- аб’ём тэкста ў тэкставым файле не павінен перавышаць 5 старонак;

- структура работы павінна ўключаць наступныя элементы:
- назва;
- мэты;
- інфармацыйна-забаўляльныя рэсурсы (віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку) ці спасылкі на іх;
- дасягнутыя вынікі;
- звесткі пра выканаўцаў.

13. Для падвядзення вынікаў Конкурсу складаецца журы (Дадатак 3).

14. Па выніках Конкурсу журы вызначае пераможцаў – I, II, III месца па кожнай намінацыі.

Журы пакідае за сабой права не прысуджаць узнагароды ці прысудзіць два дыпломы за I, II, III месца па адной з намінацый (у межах прызавога фонду).

15. Матэрыялы прымаюцца па адрасе: 230023 г. Гродна, вул. Карбышава, 17, ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага", аддзел бібліятэказнаўства (з паметкай "На конкурс") да 16 мая 2023 года.

16. Матэрыялы, якія не адпавядаюць патрабаванням да конкурсных работ, ці якія паступілі пазней названай даты, разглядацца не будуць.

17. Вынікі Конкурсу падводзяцца да 30 мая 2023 года на пасяджэнні журы і афармляюцца пратаколам.

18. Выпіска з пратакола размяшчаецца на сайце ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага" (grodnolib.by).

19. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі ў фотарамках і прызамі.

20. Фінансаванне расходаў на правядзенне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага".

21. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца: выраб дыпломаў, набыццё фотарамак (для афармлення дыпломаў) і прызы пераможцам Конкурсу.

22. Фінансаванне Конкурсу можа ажыццяўляцца за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Дадатак 1**
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку “Бібліятэка.by”

**АРГКАМІТЭТ**
абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн- крыжаванку “Бібліятэка.by”

1. Жук-Куніцкая Ірына Юр’еўна, галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветніцкай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

2. Ігнатовіч Марына Эдвардаўна, дырэктар ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

3. Давыдзік Надзея Сяргееўна, намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

4. Сцяпанава Галіна Аляксандраўна, загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

5. Лемяноўская Ірына Казіміраўна, вучоны сакратар бібліятэкі ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

6. Амельчанка Алена Іванаўна, загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

7. Міхальчык Данута Юзэфаўна, загадчык аддзела аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага".

**Дадатак 2**
да Інструкцыі аб парадку і правядзенні абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн- крыжаванку "Бібліятэка.by"

Аргкамітэт абласнога конкурсу

________________________________

________________________________

прозвішча, імя, імя па бацьку поўнасцю кіраўніка

________________________________

________________________________

месца працы

________________________________

________________________________

пасада

________________________________

________________________________

________________________________

________________________________

кантактная інфармацыя: паштовы адрас, тэлефон, адрас электроннай пошты

ЗАЯЎКА

Прашу прыняць да разгляду работу____________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
на конкурс______________________________________________________
______________________________________________________________
____________________________________________________________.

Дата Подпіс Ініцыялы і прозвішча

**Дадатак 3**
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку "Бібліятэка.by"

**СКЛАД ЖУРЫ**
абласнога конкурсу абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку "Бібліятэка.by"

1. Клімовіч Алена Віктараўна – начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, *старшыня журы Конкурсу.*

2. Ігнатовіч Марына Эдвардаўна, дырэктар ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага", *намеснік старшыні журы Конкурсу.*

3. Сцяпанава Галіна Аляксандраўна, загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага", *сакратар журы Конкурсу.*

4. Амельчанка Алена Іванаўна, загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага".

5. Давыдзік Надзея Сяргееўна, намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага".

6. Жук-Куніцкая Ірына Юр'еўна, галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветніцкай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

7. Лемяноўская Ірына Казіміраўна, вучоны сакратар бібліятэкі ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага".

8. Мазоль Ірына Тадэвушаўна, галоўны бібліятэкар групы па арганізацыі інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага".

9. Міхальчык Данута Юзэфаўна, загадчык аддзела аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.